Кінакрокі

«ЛІСТАПАД» ПАЧАЎ РАСКРЫВАЦЬ ТУЗЫ

Першая прэс-канферэнцыя кінафестывалю прайшла 17-га кастрычніка

У гэтую сераду адбылася ПАДЗЕЯ — у Falcon Club Буцік Кіно каманда Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад» абвясціла конкурсныя праграмы дакументальнага і ігравога кіно. Але прытрымала пазаконкурсныя, Нацыянальны конкурс, Індустрыяльную платформу і гасцей — усё гэта стане вядома ўжо ў панядзелак 22 кастрычніка. Фестываль, які пройдзе з 2 да 9 лістапада, адбудзецца 25-ы раз і будзе прысвечаны рэжысёру Кіры Муратавай: слоган «Пазнаючы белы свет» адсылае да аднаго з яе фільмаў. Ад каманды — на сустрэчы выступілі дырэктар і праграмныя дырэктары фестывалю — чуліся як шчаслівыя, так і горкія інтанацыі.

Юбілеі прынята адзначаць у тым ліку падвядзеннем вынікаў. І калі праграмны дырэктар Ігар Сукманаў выказаўся пра непазбыўнае шчасце далучэння да фарміравання гэтых кінапраграм, то дырэктар Анжаліка Крашэўская адзначала памяншэнне бюджэту ў параўнанні з мінулым годам, у той час як «Лістапад» і без таго распараджаецца ўдвая меншымі сумамі, чым, напрыклад, міжнародны кінафестываль у Вільнюсе.

Пры гэтым да свайго 25-годдзя фестываль прыйшоў з пэўнымі дасягненнямі, сярод якіх і акрэдытацыя Міжнароднай федэрацыі асацыяцый кінапрадзюсараў (FIAPF) — спачатку часовая, а потым і пастаянная, далучэнне Беларусі да Міжнароднай федэрацыі кінакрытыкаў і адпаведна з'яўленне на «Лістападзе» журы FIPRESCI, якое ўручае свае ўзнагароды таксама на Канскім кінафестывалі ці, скажам, Берлінале. Але, напэўна, галоўным дасягненнем можна назваць давер да Мінскага кінафестывалю з боку гледача і прафесіяналаў кіно.

Адкрыццё «Лістапада» адбудзецца 2 лістапада ў кінатэатры «Масква» з фільмам «Халодная вайна» польскага рэжысёра Паўла Паўлікоўскага — яго папярэдняя карціна «Іда» ў 2013 годзе атрымала на Мінскім кінафестывалі адразу «Золата» і «Серабро».

Сёлетнія праграмы дакументальнага кіно, па словах праграмнага дырэктара Ірыны Дзям'янавай, будуць ламаць стэрэатыпы, датычныя лічбы 13. 13 інстытуцый у Конкурсе нацыянальных кінашкол і 13 фільмаў у Асноўным конкурсе дакументальнага кіно. У першым — найлепшыя еўрапейскія кінашколы, а ў кіно, як адзначыла Ірына Мікалаеўна, вельмі важныя сувязі, распачатыя ў студэнцкія часы. У другім — «дарослыя» карціны з Польшчы, Венгрыі, Бразіліі (трэба разумець, тут шмат капрадукцыйных праектаў), аўтары якіх «часта звяртаюцца да ўласнай гісторыі, да гісторыі ўласнай сям'і. Глядзіш і ўзрушаешся, як блізка аўтары змаглі падысці да свайго героя. Стаць незаўважнымі, часткай сцяны, часткай абстаноўкі — гэта, вядома, найвышэйшае прафесійнае майстэрства. Яшчэ адна яркая асаблівасць дакументальнага кіно: мы можам бачыць, як мяняецца чалавек пад уздзеяннем абставін ці іншых людзей. Гэты працэс змянення, пераараджэння, а часам і падзення ў дакументальным кіно вельмі цікавы».

У конкурс фільмаў для дзіцячай і юнацкай аўдыторыі «Лістападзік» апроч фільмаў адкрыцця і закрыцця ўвайшло шэсць карцін, якія, настойвае праграмны дырэктар Ігар Сукманаў, раўназначныя даросламу кіно. Адкрывацца гэты конкурс будзе карцінай кінастудыі «Беларусьфільм» «Правілы геймера» Ігара Чацверыкова.

Дарэчы, 25-ы «Лістапад» зноў пашырае геаграфію — на вялікіх экранах у рамках фестывалю ўпершыню будуць паказаны фільмы з Кеніі і ЮАР. Кенійская карціна «Супа Мода» Лікарыёна Вайнайны з «Лістападзіка» сёлета таксама вылучаецца на саісканне прэміі «Оскар». Увогуле, у праграме Мінскага кінафестывалю і нядаўна апублікаванага лонг-ліста «Оскара» супала дзесяць фільмаў.

«Маладосць на маршы», як звычайна, сканцэнтравалася на дэбютах і другіх па ліку карцінах. Гэтым разам яна ўключыла ў сябе адзінаццаць работ з Індыі, Японіі, Ірана, Венгрыі, Румыніі, зноў жа шматлікія капрадукцыйныя праекты. І адзін — што незвычайна — пазаконкурсны паказ фільмаў кітайскага рэжысёра Ху Бо, які пайшоў з жыцця, — дырэкцыя не магла абмінуць яго ўвагай, але палічыла несумленным уключаць аўтара ў спаборніцтва.

Нарэшце, асноўны конкурс ігравога кіно складаецца з дзесяці карцін з Украіны, Польшчы, Балгарыі, Казахстана, Кыргызстана, В'етнама — краін, на якіх базуецца канцэпцыя «Лістапада».

«Як заўсёды, Асноўны конкурс факусуе сваю ўвагу на краінах посткамуністычнай прасторы. Гэта тэрыторыі, кіно якіх нам, як апошняму савецкаму пакаленню, вельмі добра знаёмае, бо фільмы ў кінапракаце дзяліліся на тры катэгорыі: айчынныя, то-бок кіно саюзных рэспублік, карціны сацыялістычных краін і іншы замежны капіталістычны прадукт. Сёння, наадварот, мы ўсё ведаем пра «капіталістычны» кінематограф: кінатэатры і дамашнія экраны запоўнены фільмамі з ЗША, Францыі, Вялікабрытаніі. Але што мы ведаем пра нашых, скажам так, былых суседзяў? Што мы ведаем пра саміх сябе? Мы хочам, каб фестывальны тыдзень быў прысвечаны кінематографу гэтых тэрыторый, таму што гэта тэрыторыі таксама нашых праблем і нашых клопатаў», — сказаў Ігар Сукманаў.

Да свайго 25-годдзя фестываль прыйшоў з пэўнымі дасягненнямі, сярод якіх і акрэдытацыя Міжнароднай федэрацыі асацыяцый кінапрадзюсараў (FIAPF).

Хутка мы даведаемся поўную праграму «Лістапада», убачым, што гэтым разам увайшло ў збор конкурсу беларускага кіно, даведаемся, чым будзе каштоўная сёлетняя Індустрыяльная платформа, нарэшце, якія госці прыедуць у Мінск. Да кінафестывалю — нашай галоўнай кінападзеі года — засталося два тыдні.

Поўную праграму конкурсаў дакументальнага і ігравога кіно можна знайсці на сайце listapad.com.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.

І САМАЯ ДАКЛАДНАЯ ПЕРАДАЧА СТАНУ ДЭПРЭСІІ

завяршыўся і пакінуў на сэрцы рваныя раны

прачытанні рэжысёра і пад асучасненым соусам. Каманда падладзіла спектакль пад паказ у Мінску — у дыялогах прагучалі гордыя беларусы, чысціня Мінска, беларуская смятана і грэчка, ад якой можна «адчуць смак жыцця»... Выходзячы з залы, нейкія хлопцы разважалі, што нічога ў «Вяселлі» няма звышнатуральнага, проста, маўляў, забаўка, а не тэатр. Напэўна, якраз з-за камедыйнага складніка, які стэрэатыпна «прыніжае» мастацтва да нейкага відовішча. Але «Вяселле», калі не лічыць яго крыху збітую і няёмка абыграную канцоўку, сталася пралічаным аповедам пра чалавечую натуру і крыніцай цэлага калейдаскопа эмоцый. Сям'я і сябры прыстойна сабраліся за вясельным сталом, але чалавечыя хібы і страсці ператварылі свята стварэння новай сям'і ў скандальны сямейны міжсабойчык. Бертольд Брэхт зайграў па-новаму, па-літоўску, па-сучаснаму, а спектакль паказаў звычкі, рэаліі і манеры, якія цалкам могуць сысці за нашы.

Фінска-латвійская пастаноўка «Тры мушкецёры. На ўсход ад Вены» гарэзліва накіравала мушкецёраў у сучасны свет і пракаціла іх па Усходняй Еўропе. Папулярнае ў тэатры выкарыстанне відэа заняло большую частку прасторы і ўсё ўзаемадзеянне сцэны з экранам не тое каб уразіла. Больш за тое, мушкецёры ездзілі па розных краінах у пошуках вайны, і часам выяўлялі даволі пагардлівы погляд на іншыя тэрыторыі. Саркастычна, напрыклад, яны пасмяяліся з Прыднястроўя і ў пэўным сэнсе прымусілі і гледача глядзець з іроніяй на жанчыну, што расказвае анекдот пра богам абраную тэрыторыю. У сярэдзіне ў трып спектакля неарганічна ўпісаліся стасункі паміж галоўнымі героямі, усё змяшалася, падарожжа мушкецёраў і іх пошукі занялі экран, а акцёраў часам відавочна не ведалі, як заняць.



«Арктыка». teart.by

Затое тут знайшлося супераб'яднанне: бельгійская пастаноўка «Арктыка» Ан-Сесіль Вандалем перанесла шаблоны хорараў і трылераў кінамастацтва на тэатральную сцэну. Дзеянне адбываецца на круізным лайнеры, за сцэнай пабудавана цэлая сетка ўваходаў і выхадаў, кают і калідораў, падзеі ў якіх тут жа адлюстроўваюцца на экране відэаапаратарамі (выкарыстанне відэаздымкі ў тэатральных пастаноўках можна назваць тэндэнцыяй, прыём не новы, але можа быць эфектным). Акцёры задзейнічаны ўвесь час, бачым мы іх фізічна ці на экране — яны іграюць у спектаклі (у адрозненне ад «Трох мушкецёраў»). Відэа дало магчымасць цудоўна абыгрываць кінапрыёмы і нават надало нейкага містычнага складніка — «Арктыка» сталася палітычным трылерам з забойствамі, самазабойствамі, змовамі, экалагічнымі праблемамі, супрацьстаяннем улады і электарату, помстай і музычным калектывам у глыбіні сцэны. Гэта «кіно» я паглядзела б яшчэ раз.

УСЁ ТЛЕН

Пастаноўка Цімафея Кулябіна — яго «Тангейзера» некалькі гадоў таму забаранілі ў Новасібірску з-за скаргі вернікаў — «Тры сястры» па п'есе Чэхава, несумненна, аказалася вішанькай на торце. Гэта самы неверагодны спектакль форуму. Кожны антракт — а іх у чатырохгадзінным спектаклі было тры — мне шчыра хацелася пакінуць залу і ніколі гэтага не бачыць, таму што не зусім бязвыхадная п'еса Чэхава тут дасягнула такога трагізму і песімізму, ад якога становіцца дрэнна фізічна. Дзеля пастаноўкі акцёры вывучылі мову жэстаў — героі, апроч аднаго, не вымавілі ніводнага слова, затое іх замянілі іншыя гукі, рухі, асвятленне. Ведайце, істэрыка на мове жэстаў можа быць «гучнейшай» за славесную. З пункту гледжання тэатральнага мастацтва нямыя «Тры сястры» — бяздонная, карпатлівая, неверагодная работа. Кожны акт мяняў сцэнічнае наваколле да непазнавальнасці. Трансфармацыя герояў, сімвалічнае апусценне прасторы, сюжэтныя змены стварылі чалавечую трагедыю і выклікалі адчуванне безнадзейнасці існавання на зямлі. Разбітыя мары, смерць з-за кахання, незадаволенасць жыццём, новае адкрыццё Чэхава, «усё тлен» — у спектаклі без слоў.

«ТЭАРТ» ГАВОРЫЦЬ

Балем правяць капрадукцыя, даследаванне магчымасцяў цела, выкарыстанне відэа і адсылак да кіно ў цэлым, зварот да традыцыйных матываў, глабальныя пытанні і «кругі на вадзе» вакол чалавечай натуры. Восьмы «ТЭАРТ» паказаў дзевяць пастановак — ён завяршыўся ў аўторак супярэчлівым спектаклем «Сайгон», а тэатр чарговы раз заявіў пра сябе як пра захапляльнае мастацтва — кожны раз ты быццам круціш рулетку і трапляеш на новую форму, дзе вынаходлівасць аўтараў — удала яна ўвасоблена ці не — паказвае бясконцасць іх магчымасцяў. Такі збор не можа прайсці бясследна.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.